## А. А. Мяцельскі, *Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII-XVIII стст.*, Мінск: Беларуская навука, 2010. — 664 с. Наклад 200 асобнікаў.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі з'явілася грунтоўная манаграфія, прысвечаная гісторыі найменш даследаванага рэгіёна краіны — Мсціслаўскаму княству/ваяводству ад часоў Русі да знікнення Рэчы Паспалітай. Аўтар — Андрэй Мяцельскі, адзін з вядучых навуковых супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН, вядомы даследчык усходніх абшараў Беларусі, на працягу апошніх гадоў займаўся археалагічным вывучэннем Нясвіжскага замка. Рэцэнзуемая манаграфія — вынік яго шматгадовых архіўных і бібліятэчных росшукаў, а таксама непасрэдных археалагічных раскопак. Яна актуальная хаця б таму, што дагэтуль не было адмысловага манаграфічнага даследавання па гісторыі Мсціслаўскага княства, ваяводства, горада Мсціслава, зрэшты, адсутнічаюць падобныя манаграфіі па іншых не менш важных мясцінах.

Кніга шмат у чым наватарская: 1) па тэматыцы; 2) па форме; 3) па змесце; 4) па комплексе крыніц; 5) па метадах аналізу крыніц; 6) па храналогіі. Кніга інтэрдысцыплінарная: у ёй аналізуюцца пісьмовыя крыніцы, шырока выкарыстоўваецца інфармацыя археалагічных, тапанімічных і антрапанімічных крыніц. Гэта, у сваю чаргу, прымусіла аўтара ўжываць не толькі агульнагістарычныя метады, але таксама метады гістарычнай геаграфіі і картаграфіі. Трэба адразу адзначыць, што гісторыя Мсціслаўскага княства, а пазней ваяводства, вельмі „няўдзячная" тэма з пункту гледжання крыніцазнаўчай базы. Крыніц мала і яны фрагментарныя. Інфармацыю трэба было збіраць па крупіцах з разнастайных крыніц. Менавіта адсутнасць багатай крыніцазнаўчай базы стрымлівала ранейшых даследчыкаў сур'ёзна заняцца дадзеным рэгіёнам. Мізэрная колькасць навуковых тэкстаў, прысвечаных мінуламу Мсціслаўскага княства і ваяводства, выяўляецца ўжо пры знаёмстве з гістарыяграфічным аналізам, пададзеным на пачатку кнігі.

У працы Андрэя Мяцельскага ўздымаюцца важныя праблемы: а) засяленне і фармаванне адміністрацыйных адзінак і іх межаў; б) урбаністычныя працэсы; в) канфесійная гісторыя; г) палітычная гісторыя. У кнізе моцны акцэнт зроблены на памежнае становішча рэгіёна: менавіта ўзаемаадносіны з Маскоўскай дзяржавай былі вядучымі ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Манаграфія складаецца з 7 главаў (па-беларуску правільней было б — „раздзелаў"), у якіх адлюстраваны як храналагічны прынцып, так і тэматычны. Яны ў сваю чаргу падзелены на больш дробныя падраздзелы, што дазваляла аўтару глыбей і канкрэнтней разглядаць вызначаныя тэмы і праблемы. Спіс крыніц (рукапісных і друкаваных) і літара-

туры складае 1514 пазіцый і ахоплівае амаль 70 старонак. З аднаго боку, гэта ўражвае і сведчыць пра грунтоўнасць падыходаў аўтара кнігі. З іншага боку, дадзеная падрабязнасць (асабліва пры распісванні тытулаў усіх архіўных адзінак) абумоўлена патрабаваннямі беларускай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі па зацвярджэнні навуковых дысертацый. Гэтае чынавенскае новаўвядзенне прыводзіць да марнатраўства аб'єму кнігі. Замест пералічэння на 35 старонках спісу архіўных адзінак можна было б шырэй раскрыць якуюсьці навуковую праблему. Агульна прынята ў сусветнай практыцы, што аўтар прадстаўляе архівы, у якіх былі выяўлены неабходныя матэрыялы, далей падаюцца нумары і назвы фонда, вопісаў і, калі трэба, архіўных адзінак. Складваецца ўражанне, што некаторыя сучасныя беларускія квазінавукоўцы, якія распрацоўваюць падобныя патрабаванні, спрошчваюць архіўныя пошукі альбо для сябе, альбо для сваіх знаёмых і нашчадкаў. Праўда, усё гэта падаецца пад шыльдай барацьбы з плагіятам.

У першай главе *Фізіка-геаграфічны нарыс. Шляхі зносін* аўтар на падставе гістарычных, археалагічных, фізіка-геаграфічных і тапанімічных крыніц падрабязна характарызуе прастору, у межах якой фармавалася тэрыторыя будучага Мсціслаўскага княства і пазней ваяводства. З пункту гледжання геаграфіі — гэта рэгіён Сярэдняга Пасожжа. Аўтар прасачыў працэс знішчэння лясоў, гідраграфічную і ландшафтную сітуацыю. Асабліва падрабязна ахарактарызаваны разнастайныя камунікацыі і іх элементы ад старажытнасці да канца XVIII ст. Гэта водныя, сухапутныя, цэнтральныя і мясцовыя шляхі, масты, перавозы і броды.

Наступная глава — *Землі Сярэдняга і Верхняга Пасожжа ў IX-XIII стст.* Гісторыю дадзенага рэгіёна Андрэй Мяцельскі пачынае разглядаць з VIII-IX стст., характарызуючы на падставе археалагічных крыніц этнакультурную сітуацыю. У гэты час, на яго думку, канчаткова фармуецца этнічная мяжа паміж носьбітамі культуры смаленскіх доўгіх курганоў, якія засялялі поўнач рэгіёна, і носьбітамі роменскай культуры (засялялі Ніжняе і Сярэдняе Пасожжа). Менавіта гэтая мяжа захавалася і ў пазнейшыя часы (да XIII ст.) як рубеж паміж летапіснымі крывічамі і радзімічамі. Не гаворачы канкрэтна, але з агульнага кантэксту бачна, што аўтар кнігі разглядае насельніцтва басейна ракі Сож у IX-XIII стагоддзі як славянскае — і носьбітаў археалагічных культур, і летапісных этнонімаў. Апошнія вылучаюцца пераважна на падставе жаночых упрыгожванняў (традыцыя цягнецца яшчэ ад Аляксандра Спіцына з канца XIX ст.) і некаторых асаблівасцей пахавальнага абраду альбо канструкцыі курганнага насыпу. У прынцыпе, падобны падыход не вылучаецца арыгінальнасцю, ён агульнапрыняты быў у савецкай археалогіі і працягвае эксплуатавацца да сённяшняга дня ў расейскай, украінскай, беларускай археалагічных навуках. Аднак, дума-

ецца, што вялікай будучыні ў дадзеным падыходзе няма. Ён сябе вычарпаў амаль максімальна. Нават татальнае раскопванне ўсіх захаваных курганоў удакладніць толькі вузкія прыватныя пытанні гісторыка-геаграфічнага, храналагічнага альбо культурнага характару. Сёння ўжо надышоў час паволі ставіць пытанні сацыякультурнага характару. Нават этнічная гісторыя рэгіёна падаецца нам больш складанай, чым уяўляецца большасці сучасных даследчыкаў, у тым ліку і аўтару рэцэнзуемай кнігі. Усё больш сумненняў выклікае выключна славянскі этнічны характар крывічоў, а пра радзімічаў як усходніх славян сумняваўся нават аўтар не датаванай часткі „Аповесці мінулых гадоў", напісанай у пачатку XII ст.

Наступны аспект, які разглядаецца ў другім раздзеле, гэта канструяванне сістэмы сельскага рассялення на тэрыторыі Сярэдняга Пасожжа ў X-XIII стст. Вырашэнне дадзенай задачы адбываецца таксама праверанымметадам — татальная картаграфія вядомых на сённяшні дзень археалагічных помнікаў, пераважна курганных могільнікаў і паселішчаў: гарадзішчаў і неўмацаваных селішчаў. Андрэй Мяцельскі свае высновы па дадзеных пытаннях грунтуе на 726 археалагічных комплексах, якія адносіць да сельскіх паселішчаў: 41 гарадзішча, 102 селішчы і 583 курганныя могільнікі. Праўда, на с. 47 А. Мяцельскі называе „615 комплексаў помнікаў археалогіі", а на мал. 2. „Археалагічныя помнікі X-XIII стст. у паўднёва-заходніх раёнах Смаленскай зямлі" змешчана на карце 722 пункты.

Пэўную нязгоду ў рэцэнзента выклікае тэрміналогія, запазычаная з мінулага марксісцкага перыяду айчыннай гістарыяграфіі. Напрыклад, „археалагічныя даследаванні паказалі, што гарадзішча Шаўнева з'яўляецца сядзібай буйного феадала" (с. 57). Федалізму на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў XII-XIII стст., так напраўду, у крыніцах не выяўлена, ён больш прыдуманы ідэалагічна, па рэкамендацыі Сталіна і камуністычнай партыі. Хутчэй у выпадку з гарадзішчамі (не толькі на Пасожжы) з матэрыяламі гарадскога, вайсковага ці эксклюзіўнага характару трэба казаць пра княжацкія адміністрацыйныя, вайсковыя, фіскальныя і культурна-рэлігійныя цэнтры, якія стваралісяя дзеля кантролю над адзяржаўленай тэрыторыяй. Таму больш цікавым было б паспрабаваць паставіць для вывучэння праблемы тапаграфічнага размяшчэння гарадзішчаў і спадарожных іх селішчаў і курганных могільнікаў адносна адзін аднаго, фармаванне непасрэднай акругі, функцыянаванне так званага „заплечча", якое эканамічна забяспечвала адміністрацыйныя цэнтры.

Важная навуковая праблема, якую разглядае Андрэй Мяцельскі — гэта пачатковыя этапы фармавання адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама ўзнікненне гарадоў у рэгіёне Сярэдняга і Верхняга Пасожжа. На падставе інфармацыі пераважна археалагічных крыніц,

падмацаваных паведамленнямі летапісаў і актавым матэрыялам, аўтар прадпрыняў спробу сканструяваць самую ніжэйшую прыступку адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў рэгіёне ў XI-XIII стст. — воласць. На нашу думку, гэтая спроба даволі ўдалая. На тэрыторыі Усходняй Еўропы воласць хутчэй фармавалася як пэўная тэрыторыя, якая аб'ядноўвалася вакол вызначанага цэнтра (які вылучаецца як палітычна, так і тапаграфічна). З часам дадзеныя цэнтры альбо эвалюцыянавалі ў больш значныя паселішчы з гарадскімі функцыямі, альбо знікалі, захоўваючыся толькі ў рэштках гарадзішчаў. Працэс фармавання валасцей зафіксаваўся ў археалагічных матэрыялах, у першую чаргу, у тыпах, тапаграфіі і структуры помнікаў — паселішчаў і могільнікаў. Картаграфаванне адпаведных археалагічных помнікаў у спалучэнні з натуральнымі фізіка-геаграфічнымі ўмовамі дазваляюць вызначыць колькасць валасцей ў межах больш значных палітыка-тэрытарыяльных адзінак, а таксама прыкладныя іх межы. Заўважым, што найбольшая небяспека для даследчыкаў у працы з археалагічным матэрыялам з'яўляецца яго храналогія. Чым больш дакладаная датыроўка таго ці іншага помніка, тым больш абгрунтаваныя высновы і трывалыя гістарычныя канструкцыі.

Для дакладнасці вызначэння межаў валасцей А. Мяцельскі карыстаецца і рэтраспектыўным метадам — гэта значыць выкарыстоўвае інфармацыю з пазнейшых крыніц XV-XVII стст., а нават XVIII стагоддзя. Падобная методыка мае права на існаванне, тым больш аўтару ўдалося даказаць, што падставы адміністратыўна-тэрытарыяльнай структуры будучага Мсціслаўскага ваяводства ствараліся ў XI-XIII стст. і з незначнымі зменамі функцыянавалі ў пазнейшыя часы.

Найбольш непрымальным для нас з'яўляецца традыцыйны падыход (як спадчына савецкай гістарычнай і археалагічнай навукі) Андрэя Мяцельскага да ўзнікнення некаторых гарадоў Пасожскага рэгіёна, асабліва ў яго паўднёвай, „радзіміцкай", частцы. На яго думку, калі „на поўдні рэгіёна гарадскія цэнтры выраслі на падставе першапачатковых племянных цэнтраў роменскага насельніцтва, то ў больш паўночных раёнах на працэсе горадабудаўніцтва ляжыць адзнака мэтанакіраванай дзейнасці вялікакняжацкай смаленскай адміністрацыі" (с. 115). Аднак вызначэнне месца для гарадскога цэнтра на гарадзішчы папярэдняй эпохі не тое ж самае, што ператварэнне „пляменнага цэнтра" ў горад. Заўважым, што за апошнія 20 год у бачанні працэсаў узнікнення гарадоў як у гістарыяграфіі, так і археалогіі на Захадзе і часткова на Усходзе Еўропы адбыліся значныя змены (звяртаем увагу чытачоў на адмысловы том № 32 часопіса „Archaeologia Polona" за 1994 год, з падтытулам „The Origins of Towns in Temperate Europe"). У першую чаргу гэта выяўляецца ў паступовым адыходзе ад эвалюцыйных этапаў урбанізацыі

кшталту: ад племянных „градаў”, праз „протагарады” ці „эмбрыёны” і гарады на лакальным альбо княжацкім праве, да фармальна лакалізаваных гарадоў. Узамен больш увагі звяртаецца на значэнне істотных структурных змен у грамадскім і палітычным жыцці ў сярэднявеччы. Маецца на ўвазе, што палітычныя ўлады мэтанакіравана і планава ініцыявалі ўтварэнне ранніх гарадскіх цэнтраў, паходжанне якіх немагчыма вытлумачыць нейкімі натуральнымі вынікамі паступовага росту сацыяльна-эканамічных фактараў.

У трэцяй главе *Мсціслаўскае княства другой паловы XII — пачатку XVI стст.* рэгіён Сярэдняга і Верхняга Пасожжа разглядаецца як аснова тэрыторыі Мсціслаўскага княства. Аўтар вельмі падрабязна і грунтоўна аналізуе ўсе даступныя яму крыніцы дзеля канструявання вельмі дакладных знешніх і ўнутраных межаў княства. Вызначэнне межаў адбываецца ў шчыльнай сувязі з адпаведнымі палітычнымі і вайсковымі кантэкстамі ў даследаваным рэгіёне. У выніку аўтар вылучае тры этапы ў працэсе тэрытарыяльнага фармавання Мсціслаўскага княства і яго адміністрацыйнага кіравання і падпарадкавання: I — канец XII — першая палова XIV стст., як частка Смаленскага княства, мела найбольшую тэрытарыяльную прастору; II — канец XIV ст. (1389 г.) — 1483 г., калі было адноўлена ў складзе ВКЛ, але ўжо ў меншых памерах, як спадчынныя ўладанні дынастыі Лынгвенавічаў; III — з 1499 г. па 1527 г., зноў адноўлена як пасаг княгіні Ульяны Мсціслаўскай з роду Лынгвенавічаў яе мужу князю Міхаілу Іванавічу Жаслаўскаму. На апошнім этапе тэрыторыя княства ўвогуле паменшылася толькі да дзвюх валасцей — Мсціслава і Мгліна. Неабходна звярнуць увагу, што аўтар вельмі грунтоўна прадставіў генеалагічную сітуацыю з панаваўшымі на Мсціслаўшчыне Сямёнам-Лунгвенам Альгердавічам і яго нашчадкамі.

Не абмінуў А. Мяцельскі і тэмы мсціслаўскіх князёў у Маскоўскім царстве, у першую чаргу, збеглага ў Маскву ў 1526 г. Фёдара Міхайлавіча і яго нашчадкаў — сына Івана, унукаў Васіля і асабліва Фёдара Іванавіча. На працягу XVI — першага трыццацігоддзя XVII стст. род князёў Мсціслаўскіх быў найвышэйшай палітычнай элітай і адыгрываў адну з вядучых роляў у палітычным жыцці Маскоўскай дзяржавы. Яны ўвесь час знаходзіліся вельмі блізка цара, часта самі ўплывалі на лёсы дзяржавы, таму спазнавалі на ўласнай скуры разнастайныя „ласкі” Івана IV. Больш таго, менавіта Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі-ўнук быў найбольш актыўным змагаром з Барысам Гадуновым за маскоўскі трон і адным з вядучых персанажаў у перыяд Смуты. На жаль, і маскоўская галіна князёў Мсціслаўскіх, як і літоўская, пасля смерці Фёдара Іванавіча ў 1622 г. выгасла па мужчынскай лініі і канчаткова знікла. А тытул „князя мсціслаўскага” з гэтага часу насілі прадстаўнікі роду Раманавах ад цара Аляксея Міхайлавіча да імператара Мікалая II, у часы калі Мсціслаў уваходзіў

у склад Рускага царства ці Расейскай імперыі. Адзначым, што ў айчыннай гістарыяграфіі маскоўскі аспект у гісторыі ВКЛ разглядаецца рэдка, фрагментарна і кампілятыўна. Сёння, мусіць, адзіным паслядоўным даследчыкам літоўска-маскоўскіх адносін у XIV-XVI стст. у Беларусі з'яўляецца Віктар Цемушаў. Таму дадзеная тэма надалей з'яўляецца своеасаблівай *tabula rasa.* Спадзяемся, што ў беларускай гістарыяграфіі тэма ролі і значэння літоўска-рускага баярства ў гісторыі Маскоўшчыны нарэшце атрымае свайго даследчыка.

Наступная глава — *Мсціслаўскае ваяводства ў другой паловае XVI — XVIII стст.* Пасля адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1564-1565 гг. канчаткова склалася структура ВКЛ, сярод якой знайшлося месца для Мсціслаўскага ваяводства, якое было самым малым па плошчы, складалася з дзвюх папярэдніх валасцей — Мсціслаўскай і Крычаўскай, і не падзялялася на паветы. Андрэй Мяцельскі зноў вельмі падрабязна і грунтоўна прадстаўляе тэрытарыяльныя межы новастворанай адзінкі — як знешнія, так і ўнутраныя. Асабліва шмат увагі надае аўтар вызначэнню межаў і складу дзяржаўных уладанняў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства — Крычаўскаму (самаму значнаму), Мсціслаўскаму, Хіславіцкаму, Жукаўскаму і іншым староствам. Аднак для нас надалей застаюцца загадкавымі прычыны вылучэння асобнага Мсціслаўскага ваяводства ў структуры ВКЛ. Няма адказу на гэтае пытанне і ў рэцэнзуемай кнізе. Палітычная гісторыя Мсціслаўскага ваяводства прадстаўлена ў кнізе сціпла па аб'ёме, але вельмі грунтоўна па змесце. Натуральна, што дадзеная тэма патрабуе асобнага манаграфічнага даследавання. Таму тэкст А. Мяцельскага адносна палітычнай гісторыі варта разглядаць як уступ альбо арыенцір для будучых даследаванняў.

Глава пятая — *Дынаміка асваення сельскіх абшараў Мсціслаўскага княства/ваяводства ў XVI-XVIII стст.* Сапраўдным навуковым подзвігам трэба лічыць складзеныя Андрэем Мяцельскім асобныя гістарычныя карты пасяленчай структуры (населеных пунктаў) Мсціслаўскага княства ў XV ст. і Мсціслаўскага ваяводства ў XVI, XVII і XVIII стагоддзях. Яны з'яўляюцца найлепшай ілюстрацыяй працэсаў і дынамікі засялення тэрыторыі ваяводства. На XV ст. аўтар выявіў 101 населены пункт, у наступным XVI ст. ужо 245, у XVII ст. — 379, у XVIII ст. — 532. Менавіта тая структура, якая склалася да сярэдзіны XVIII ст., існуе да сённяшняга дня. Думаецца, што колькасць паселішчаў на тэрыторыі гістарычнай Мсціслаўшчыны ў выніку савецкіх сацыялістычных эксперыментаў нават зменшылася.

Глава шостая — *Урбанізацыйныя працэсы ў Мсціслаўскім княстве і ваяводстве ў XIV-XVIII стст.* У манаграфіі А. Мяцельскага ўпершыню вельмі дакладна прадстаўлена планіровачная структура і тапаграфія гарадоў Мсціслаўскага ваяводства: Мсціслава і Крычава, а такса-

ма пададзена інфармацыя пра Мглін, Дрокаў, Папову Гару і Радамлю. Аўтар прапануе свае схематычныя планы тапаграфічнай структуры Мсціслава і Крычава, якія пабудаваны на падставе гістарычных, археалагічных і картаграфічных матэрыялаў. Увогуле гарадам усходніх абшараў Вялікага Княства Літоўскага ў новы час навукоўцы надавалі вельмі мала ўвагі. Таму кожнае даследаванне ў дадзеным накірунку значна пашырае нашы веды. Па прычыне кароткачасовага знаходжання ў межах Мсціслаўскага княства (да часоў вайны з Масковіяй 1500-1503 гг.) Мгліна, Паповай Гары і Дрокава, апісанне іх абмежавана толькі шэрагам фактаў. Больш таго, у XVII ст. названыя гарады былі ненадоўга далучаны да Смаленскага ваяводства ў складзе РП.

На жаль, як адзначалася раней, аўтар трымаецца марксісцкай пазіцыі па пытаннях генезу гарадоў і іх функцый — „гарады былі вынікам развіцця прадукцыйных сіл грамадства, а іх эканоміка (...) аказвала ўплыў на фарміраванне і развіццё мясцовых, а часам міжнародных рынкаў" (с. 287). Спрэчным з'яўляецца сцвярджэнне аўтара, што на тэмпы ўрбанізацыі Мсціслаўскага рэгіёна ў XIV-XV стст. уплывала адсутнасць буйнога землеўладання, „без якога быў немагчымым буйнамаштабны ўрбаністычны працэс", і яго павольнасць.

Вельмі падрабязна Андрэй Мяцельскі разглядзеў таксама ўзнікненне, прававую прыналежнасць і тапаграфію ўсіх мястэчак у межах Мсціслаўскага ваяводства на працягу XVI-XVIII стст. Агулам іх налічвалася 22. Вартае ўвагі назіранне аўтара, што на колькасць мястэчак моцна паўплывала дзейнасць прадстаўнікоў роду Радзівілаў, якія трымалі буйное па памерах Крычаўскае староства ў XVIII ст. Узнікае адразу пытанне да даследчыка і будучых гісторыкаў: якія мэты мелі на ўвазе князі Радзівілы, пашыраючы паўсюдна ў сваіх уладаннях сетку і колькасць мястэчак?

Глава сёмая — *Канфесійнае жыццё ў Мсціслаўскім княстве і ваяводстве ў XII-XVIII стст.* На пачатку дадзенага раздзела аўтар па традыцыйнай схеме, пераважна на падставе археалагічнага матэрыялу, прасочвае працэс паступовага пераходу насельніцтва (асабліва вясковага) Сярэдняга Пасожжа ад паганства да хрысціянства на працягу не менш 400-500 год. Выкарыстоўваецца інфармацыя з аналізу пахавальнай абраднасці і пахавальнага інвентару.

Хрысціянскія канфесіі на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства разглядаюцца аўтарам пераважна праз лакалізацыю, фундаванне, знешні і ўнутраны выгляд культавых будынкаў. Вельмі падрабязна разглядаецца развіццё Праваслаўнай царквы на тэрыторыі Мсціслаўскага княства ў XIV-XVI стст. Аўтар прыходзіць да высновы, што Мсціслаўшчына, разам з іншымі ўсходнімі рэгіёнамі Рэчы Паспалітай, з'яўлялася апірышчам праваслаўя ў краіне. Цяжка пагадзіцца са сцвярджэннем

аўтара, што парушэнне міжканфесійнага спакою ў рэлігійным жыцці ВКЛ увогуле і Мсціслаўшчыны ў прыватнасці звязана з распаўсюджваннем контррэфармацыі і актыўнай дзейнасцю езуітаў (с. 402). Гэтае сцвярджэнне даволі шаблоннае, народжанае ў савецкую эпоху. Як у добрым, дык хваляць усе канфесіі, як нешта дрэннае, дык вінаваты каталіцызм, і шкадуюць праваслаўе. Нават пры слабой даследаванасці ў айчыннай гістарыяграфіі канфесійнага жыцця ВКЛ у сярэднявеччы і новым часе, думаецца, яно было больш складаным і неадназначным. Пацвярджэннем з'яўляецца актыўная абарона і трываласць Праваслаўнай царквы менавіта ў Мсціслаўскім ваяводстве. Рэлігіі продкаў трымалася значная колькасць шляхты, пра што сведчаць шматлікія фундацыі цэркваў і манастыроў. У параўнанні з іншымі тэрыторыямі актыўны перавод праваслаўных цэркваў і манастыроў ва ўніяцтва адбываецца ў межах Мсціслаўскага ваяводства толькі з 30-х гадоў XVIII ст. і толькі ў сельскіх раёнах. Гарадское насельніцтва надалей трымалася праваслаўя. Сапраўдным цэнтрам праваслаўя з 40-х гадоў XVII ст. робіцца Тупічэўскі і іншыя манастыры. Жах выклікаюць фотаздымкі сучаснага стану цэркваў тагачасных манастыроў — Ануфрыеўскага і Пустынскага, змешчаныя А. Мяцельскім у кнізе. Для мяне гэта яскравая ілюстрацыя фарысейства з боку беларускіх чыноўнікаў — ад самага высокага і да ніжэйшага — калі яны клянуцца ў адданасці маскоўскай Расійскай Праваслаўнай Царкве, а ў сваіх словах часта спасылаюцца на Бога.

Падрабязна аўтар прадстаўляе і развіццё Каталіцкага касцёла ў межах Мсціслаўскага ваяводства, якое, па пісьмовых крыніцах, распачынаецца па-сапраўднаму толькі з пачатку XVII ст. Станоўчым бокам кнігі трэба лічыць спробу ахарактызаваць іудзейскую веру на Мсціслаўшчыне, а таксама старонку (с. 472), прысвечаную гісторыі татараў.

Асобна трэба адзначыць дадаткі, асабліва 17 табліц. Варта іх пералічыць поўнасцю. Дадатак 1 — фрагменты з Наўгародскага чацвёртага летапісу і Румянцаўскага спісу беларуска-літоўскіх летапісаў пра бітву пад Мсціславам у 1386 г.; дадатак 2 — аўтарскі пераклад з польскай мовы пацвярджальных прывілеяў аб наданні Крычаву магдэбурскага права ў 1633 г.; дадатак 3 — прывілей караля Рэчы Паспалітай Уладзіслава IV Вазы ад 16 верасня 1634 г. і пацвярджальны прывілей з дапаўненнямі і тлумачэннямі ад 4 лістапада 1644 г. аб наданні гораду Мсціславу магдэбурскага права; дадатак 4 — табліца дзяржаўцаў, старастаў і войтаў мсціслаўскіх ад 1527 г. да 1772 г.; дадатак 5 — ваяводы Мсціслаўскага ваяводства; дадатак 6 (адзін з самых вялікіх) — спіс ураднікаў Мсціслаўскага ваяводства ад 1533 г. да сярэдзіны 90-х гадоў XVIII ст.; дадатак 7 — смаленскія епіскапы Кіеўскай мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярхату ад 1136 г. да 1514 г.; дадатак 8 — полацкія, віцебскія і мсціслаўскія

архіепіскапы Кіеўскай мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярхату ў 1535-1595 гг.; дадатак 9 — магілёўскія, аршанскія і мсціслаўскія епіскапы Кіеўскай мітраполіі (да 1686 г. Канстанцінопальскага патрыярхату, ад 1686 г. — Маскоўскага); дадатак 10 — спіс дзяржаўцаў Крычаўскага староства з канца XV ст. да 1774 г.; дадатак 11 — сябры Мсціслаўскага магістрата; дадатак 12 — сябры Крычаўскага магістрата; дадатак 13 — дынаміка заснавання новых вёсак на землях старых вёсак Крычаўскага староства ў канцы XVII — XVIII ст.; дадатак 14 — спіс населеных пунктаў Мсціслаўскага княства XIV-XV стст.; дадатак 15 — населеныя пункты Мсціслаўскага ваяводства, што з'яўляюцца ў крыніцах у XVI ст.; дадатак 16 — населеныя пункты Мсціслаўскага ваяводства, што з'яўляюцца ў крыніцах у XVII ст.; дадатак 17 — населеныя пункты Мсціслаўскага ваяводства, што з'яўляюцца ў крыніцах у XVIII ст.

Натуральна, што ў адной манагарафіі, нават такой значнай (аб'ёмнай) як кніга А. Мяцельскага (дарэчы, мусіць, па колькасці старонак — 664 с. — адзіная ў сучаснай беларускай навуцы) і прысвечанай аднаму канкрэтнаму рэгіёну, немагчыма асвятліць нават палову гістарычных сюжэтаў. Для будучых даследчыкаў застаюцца тэмы больш грунтоўнай палітычнай і эканамічнай гісторыі Мсціслаўскага ваяводства, гісторыі шляхты, мяшчанства, сялянства, этнічных груп, штодзённага жыцця розных сацыяльных слаёў, канфесійныя і этнакультурныя ўзаемаадносіны, генеалогія, геральдыка, сфрагістыка. Але самае важнае, што зараз кожны наступны даследчык гістарычнай Мсцілаўшчыны мае трывалы грунт пад нагамі ў выглядзе манаграфіі Андрэя Мяцельскага.

На заканчэнні хочацца падзяліцца яшчэ адной рэфлексіяй. Кніга Андрэя Мяцельскага, прысвечаная мінуламу Мсціслаўскага княства і ваяводства ад XII да канца XVIII стст. з'явілася апошнім каменем для паўнавартаснага агульнага ўяўлення аб спецыфічным і ўнікальным Вялікім Княстве Літоўскім. На шчасце, чарговы раз пацвярджаецца меркаванне аб багацці і разнастайнасці ВКЛ, з'яўляецца і ўзмацняецца жаданне разглядаць яго па-за межамі нацыянальных альбо касмапалітычных гістарыяграфій. ВКЛ трэба вывучаць у межах уласна вэкаэлаўскага дыскурсу. Кніга Андрэя Мяцельскага, разам з падобнай манаграфіяй украінскага гісторыка Пятра Кулаківьскага, прысвечанай Чарнігаўска-Северскаму ваяводству ў 1618-1648 гг., з'яўляецца добрым вадэмекумам. Папросту, па прачытанні рэцэнзуемай кнігі адразу стала відавочным неабходнасць падобных даследаванняў па іншых ваяводствах, а лепей паветах Вялікага Княства Літоўскага. Калі гэта атрымаецца зрабіць, нашыя веды пра ВКЛ пяройдуць на абсалютна іншы інтэлектуальны і гістарыясофскі ўзровень.

**Генадзь Семянчук**
(Гродна)